*В.Ч. Гронская,*
*дацэнт кафедры беларускай філалогіі*
*і сусветнай літаратуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў,*
*кандыдат філалагічных навук*

# ПАЗНАВАЛЬНАЯ І ВЫХАВАЎЧАЯ ФУНКЦЫІ ЖАНРУ ПРЫРОДАЗНАЎЧАЙ КАЗКІ (на прыкладзе казкі Алены Масла «Як пані Чаротная на госці ў Палангу бегала»)

Цікавым жанрам літаратуры для дзяцей і юнацтва з’яўляецца прыродазнаўчая казка. Гэты жанр, які існуе не так даўно, спалучае ў сабе рысы навукова-пазнавальнай літаратуры (дапамагае раскрыць пытанні прыродазнаўства) і літаратуры этычнай (сцвярджае сістэму маральных каштоўнасцей).

Адным з пачынальнікаў жанру прыродазнаўчай казкі быў рускі пісьменнік В. Біянкі. Яго казкі з рэалістычным падмуркам спалучаюць у сабе прыкметы навукова-папулярнага твора і мастацкага. Пры гэтым развіццё казачнага сюжэта дае магчымасць драматызацыі, апоры на гульнявое яго выкананне. Казка захапляе вобразнасцю, незвычайнасцю сітуацый, у якія трапляюць героі, і ўчынкамі, што дэманструюць іх характары. Казка прымушае дзяцей рабіць пэўныя высновы, выхоўвае духоўнасць. Менавіта гэтыя якасці казкі выкарыстоўваў В. Біянкі і следам за ім іншыя дзіцячыя пісьменнікі-прыродазнаўцы.

У беларускай літаратуры жанр прыродазнаўчай казкі і – больш шырока – дзіцячай кнігі пра прыроду распаўсюдзіўся ў апошнія дзесяцігоддзі. Асаблівы ўздым даследчыкі адзначаюць у 2000-х гг. [1]. У якасці прыкладаў можна назваць такія творы: «Карона на дне віра, альбо Казкі з хутара Юстыны» Л. Рублеўскай, «Казкі з гербарыя» Р. Баравіковай, «Малая дзіцячая Чырвоная кніга» В. Гардзея і інш. Беларускіх пісьменнікаў найперш прываблiваюць гісторыі з жыцця жывёл і раслін, унесеных у Чырвоную кнігу. Значная іх колькасць увайшла ў зборнік «Чырвоная кніга ў казках і вершах», укладальнікам якога з’яўляецца Р. Баравікова.

Менавіта да персанажаў, унесеных у Чырвоную кнігу, звяртаецца і Алена Масла ў кнізе «Як пані Чаротная на госці ў Палангу бегала: казачныя гісторыі з жыцця дапытлівай рапухі-вандроўніцы, расказаныя ёй самой» [3]. Нягледзячы на тое, што ў падзагалоўку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падкрэсліваецца наяўнасць шэрагу гісторый, кніга мае скразны сюжэт. Дзеючымі асобамі з’яўляюцца «насельнікі» Чырвонай кнігі: рэдкія прадстаўнікі фаўны Беларусі. Аўтар (і ўвогуле чалавек) уведзены ў твор толькі ў якасці сувязнога звяна паміж распаведзенай гісторыяй і чытачом, а апавядальніцай выступае пані Чаротная, старая рапуха, якая дзеліцца досведам з малодшым пакаленнем.

Кніга А. Масла ўваходзіць у серыю «Казкі XXI стагоддзя», прысвечаную разнастайным пазнавальным казкам. Іх мэта – даць дзецям-чытачам веды пра пэўныя сучасныя з’явы, але захаваўшы казачны пачатак. У падобных казках павінен вытрымлівацца баланс паміж рэальным і фантастычным, і кніга А. Масла добра гэты баланс дэманструе. Пісьменніца знаёміць дзяцей з жыццём асобных прадстаўнікоў жывёльнага свету, пры гэтым пазнавальны матэрыял звязваецца з выхаваўчым і забаўляльным.

Сюжэтную аснову кнігі складае гісторыя аб тым, як пані Чаротная, будучы яшчэ маладой, здзейсніла поўнае цяжкасцей і прыгод падарожжа да сваёй цёткі Крумкі (ад Прыдзвіння да Паланґі). На гэтым шляху яе чакалі розныя перашкоды і мноства новых знаёмстваў, а ў Паланзе гераіня сустрэла каханне. І хаця, вярнуўшыся дадому, яна ўбачыла, што ўсе яе сваякі і суседзі загінулі падчас Вялікага налёту буслоў, каханне дало ёй магчымасць заснаваць новую дынастыю Чаротных рапух.

Відавочным з’яўляецца пазнавальны аспект твора А. Масла. У першую чаргу гэта выяўляецца ў выбары дзеючых асоб, у якасці якіх выступаюць чаротная рапуха, дазорца-ўладар, глейнік невядомы і іншыя рэдкія прадстаўнікі беларускай фаўны. Аўтар не проста называе іх чытачам, але і стварае выразныя, яскравыя характары, якія адпавядаюць прыродным уласцівасцям і паводзінам названых персанажаў. А самі гэтыя ўласцівасці падаюцца пісьменніцай у своеасаблівым дадатку – пераліку дзейных асоб, што месціць звесткі з Чырвонай кнігі Беларусі [3, с. 80–84]. Апрача таго, у казцы грунтоўна і падрабязна апісваюцца месцы пражывання таго ці іншага прадстаўніка фаўны і нават згадваюцца абмежавальныя фактары, што замінаюць распаўсюджванню рэдкіх відаў. Пры гэтым матэрыял падаецца такім чынам, што чытач не проста атрымлівае сухія факты, але сочыць за цікавым развіццём падзей і аналізуе сітуацыі, у якія трапляюць героі.

Да прыкладу, у дадатку падаюцца наступныя звесткі пра дазорцу-ўладара: … *Адна з самых вялікіх прыгожых стракоз беларускай фаўны. <…> Жывуць у зоне вялікіх азёр,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*слабапраточных вадаёмаў. Стракозы адлятаюць на значныя адлегласці ад месцаў выпладу* [3, с. 82]. У самім тэксце гэты персанаж з’яўляецца ў пачатку падарожжа галоўнай гераіні. Аўтар акцэнтуе ўвагу ў першую чаргу на прыгажосці стракозы: *Проста ў мяне перад носам застыла ў паветры страказа, ды такая прыгожая! Грудкі і брушка ярка-зялёныя, вочы вялікія-вялікія! І такія дапытлівыя!* [3, с. 24]. Потым страказа, знаёмячыся з пані Чаротнай, сама расказвае пра асобныя свае ўласцівасці: *Я нарадзілася зусім нядаўна, але адразу ж атрымала ў спадчыну спрадвечную здатнасць нашага роду адмыслова арыентавацца ў прасторы, сачыць за тым, што адбываецца на зямлі, з вышыні, і, бывае, папярэджваць небяспеку! Адным словам, несці дазор!* [3, с. 25]. А вось пра яе месца жыхарства і здольнасць адлятаць на значныя адлегласці ад яго мы даведваемся з той сітуацыі, што апісвае дапамогу стракозы пані Чаротнай: *…Я паспрыяю табе – адвяду да ціхай лясной рачулкі – яна якраз цячэ ў патрэбным табе кірунку* [3, с. 25]. Гэта толькі адзін прыклад, але па такім узоры пабудаваныя гісторыі пра кожнага з рэдкіх прадстаўнікоў беларускай фаўны. Чытач, такім чынам, мае магчымасць атрымаць навуковыя звесткі, пададзеныя ў мастацкай форме, што з’яўляецца важнай характарыстыкай жанру пазнавальнай казкі.

Але пазнавальны аспект – гэта толькі адна складовая твора А. Масла. Як ужо згадвалася, прыродазнаўчая казка не толькі знаёміць дзяцей з жыццём расліннага і жывёльнага свету, але дае магчымасць аналізаваць сітуацыі, задумвацца пра агульначалавечыя каштоўнасці, назіраць за жыццёвымі заканамернасцямі, рабіць уласныя высновы – мае выхаваўчую функцыю.

Кніга А. Масла пабудавана як аповед старой рапухі, якая расказвае сваім унукам пра прыгоды часоў маладосці. Сама форма падштурхоўвае да пэўнага ўзроўню павучальнасці. Гісторыя галоўнай гераіні і тыя цяжкасці, якія давялося ёй перажыць, даюць ёй магчымасць звяртацца да сваіх слухачоў з заўвагамі і высновамі, функцыя якіх – паказаць узор паводзін, перасцерагчы ад памылак, выхаваць тыя ці іншыя якасці. Пані Чаротная вучыць унукаў любіць сваіх бацькоў, быць ветлівымі, вернымі, удзячнымі, шчырымі, спагадлівымі і робіць гэта на прыкладзе ўласнай гісторыі. Гераіня распавядае пра свае памылкі і поспехі, абмяркоўвае паводзіны новых знаёмых, паказвае, да чаго можа прывесці той або іншы ўчынак. Кожная яе прыгода заканчваецца высновай, якую гераіня зрабіла ў свой час і якую хоча данесці да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

малодшага пакалення. Часам гэтыя высновы сфармуляваныя як рознага кшталту маральныя імператывы: *Гэта вельмі важна – мець сябра, мае даражэнькія!* [3, с. 27]; *Гэта толькі здаецца, што ледзь ад хаты адышоўся, а цябе ўжо не ведаюць. Таму наперад хачу маладых папярэдзіць: думайце, перш чым нешта ўчыніць. І помніце: добрая слава на печцы ляжыць, а благая па дарожцы бяжыць…* [3, с. 43].

Аднак было б няправільным палічыць, што казка А. Масла носіць выключна маралізатарскі характар. Апрача пазнавальнага і выхаваўчага ў гэтага твора вельмі выразны і забаўляльны аспект. Ад самага пачатку твор напоўнены іроніяй, якая прасочваецца на розных узроўнях тэксту. Цікавай з’яўляецца, да прыкладу, сама форма казкі, так званы «тэкст у тэксце»: пісьменніца расказвае нам, як выпадкова пачула аповед старой рапухі (які і складае асноўны змест твора). Тонкай іроніяй напоўненыя выказванні і размовы казачных персанажаў. Прыгоды пані Чаротнай – гэта цікавыя і займальныя гісторыі, якім уласцівы не толькі выхаваўчы пачатак, але і проста захапляльны сюжэт. Асобныя крытыкі нават сцвярджаюць, што «ў прыгодах жабкі адчуваецца беларуская шляхецкая гісторыя. А прыгоды жучкоў і ракавінак нагадваюць гісторыі смелых рыцараў і прыўкрасных паненак, спрытных авантурыстаў і ўзнёслых летуценнікаў» [2, с. 9].

Такім чынам, твор А. Масла з’яўляецца ўдалым узорам спалучэння ў жанры прыродазнаўчай казкі рыс навукова-пазнавальнай і этычнай літаратуры і выразна дэманструе асноўныя функцыі гэтага жанру: пазнавальную, выхаваўчую і забаўляльную.


1. *Бязлепкіна, А.* Дарослая дапамога дзіцячай літаратуры: як пісаць, рэкламаваць і выкладаць літаратуру для дзяцей / А. Бязлепкіна // Маладосць [Электронны рэсурс]. – 2011. – №9. – Рэжым доступу : http : //www.maladost.lim.by/?p=265. – Дата доступу : 12.03.2012.

2. *Марціновіч, Д.* З казкай – у ХХІ стагоддзе / Д. Марціновіч // ЛіМ. – 2011. – 25 сак. – С. 9.

3. *Масла, А.С.* Як пані Чаротная на госці ў Палангу бегала: казачныя гісторыі з жыцця дапытлівай рапухі-вандроўніцы, расказаныя ёй самой : для мал. шк. узросту / А. Масла. – Мінск : Мастац. літ., 2010. – 86 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ